*УДК 910.929*

# ЗНАЧЕНИЕ НАУЧНОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ ГАВРИИЛА ГОРЕЦКОГО В СТАНОВЛЕНИИ БЕЛОРУССКОЙ НАЦИОНАЛЬНОЙ ШКОЛЫ ЭКОНОМИЧЕСКОЙ ГЕОГРАФИИ

*Запрудский И. И.*
*Белорусский государственный университет,*
*г. Минск, Республика Беларусь, e-mail: albarutenicageo@gmail.com*

Статья посвящена выявлению значения научной деятельности Гавриила Горецкого в становлении белорусской национальной школы экономической географии. Цель работы заключается в биографическом описании научной деятельности ученого и анализе его влияния на развитие новых направлений исследований в экономической географии Беларуси. Автор считает, что демографические и экономико-географические труды Г. Горецкого имеют практическое значение, поэтому заслуживают внимания и современного переосмысления. Основное внимание было уделено определению теоретико-методологического фундамента, характерного для исследований Г. Горецкого. Анализ научных работ позволил прийти к выводу, что на деятельность ученого большое влияние оказали представители русской номографической школы, основанной на полевых исследованиях, использовании математических и статистических методов, детальных расчетах и районировании территории.

Ключевые слова: Гавриил Горецкий; экономическая география; научная школа; биография; Беларусь.

# ЗНАЧЭННЕ НАВУКОВАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ГАЎРЫЛЫ ГАРЭЦКАГА Ў СТАНАЎЛЕННІ БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ШКОЛЫ ЭКАНАМІЧНАЙ ГЕАГРАФІІ

*Запрудскі І. І.*
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь, e-mail: albarutenicageo@gmail.com*

Артыкул прысвечаны выяўленню значэння навуковай дзейнасці Гаўрылы Гарэцкага ў станаўленні беларускай нацыянальнай школы эканамічнай геаграфіі. Мэта работы заключаецца ў біяграфічным апісанні навуковай дзейнасці вучонага і аналізе яго ўплыву на развіццё новых кірункаў даследаванняў у эканамічнай геаграфіі Беларусі. Аўтар лічыць, што дэмаграфічныя і эканоміка-геаграфічныя работы Г. Гарэцкага маюць практычнае значэнне, таму заслугоўваюць ўвагі і сучаснага пераасэнсавання. Асноўная ўвага была нададзена вызначэнню тэарэтычна-метадалагічнага падмурка, характэрнага для даследаванняў Г. Гарэцкага. Аналіз навуковых работ дазволіў прыйсці да высновы, што на дзейнасць вучонага зрабілі моцны ўплыў прадстаўнікі рускай намаграфічнай школы, заснаванай на палявых даследаваннях, выкарыстанні матэматычных і статыстычных метадаў, дэталёвых разліках і раянаванні тэрыторыі.

Ключавыя словы: Гаўрыла Гарэцкі; эканамічная геаграфія; навуковая школа; біяграфія; Беларусь.

# THE IMPORTANCE OF HAŬRYLA HARECKI'S SCIENTIFIC ACTIVITY IN THE FORMATION OF THE BELARUSIAN NATIONAL SCHOOL OF ECONOMIC GEOGRAPHY

*Zaprudski I. I.*
*Belarusian State University,*
*Minsk, Republic of Belarus, e-mail: albarutenicageo@gmail.com*

The article is devoted to revealing the significance of the scientific activity of Haŭryla Harecki in the formation of the Belarusian national school of economic geography. The purpose of the work is to provide a biographical description of the scientist's activity and analyze his influence on the development of new research areas in the economic geography of Belarus. The demographic, economic and geographical works of H. Harecki are of practical importance, therefore they deserve attention and modern rethinking. The main attention was paid to the definition of the theoretical and methodological foundation, characteristic of the research of H. Harecki. The analysis of scientific works led to the conclusion that the activities of the scientist were greatly influenced by representatives of the Russian nomographic school based on field research, the use of mathematical and statistical methods, detailed calculations and regionalization of the territory.

Keywords: Haŭryla Harecki; economic geography; scientific school; biography; Belarus.

У 2020 г. Беларусь адзначала 120-годдзе з дня нараджэння знакамітага сына і выдатнага навукоўцы Гаўрылы Іванавіча Гарэцкага (1900 – 1988 гг.). У навуцы Гаўрыла Іванавіч найперш вядомы як доктар геолага-мінералагічных навук, акадэмік Беларускай акадэміі навук і стваральнік беларускай школы чацвярцічнай геалогіі. Аднак яго працы таксама маюць вялізнае значэнне для геаграфіі, гісторыі, дэмаграфіі ды эканомікі. Дагэтуль застаецца актуальным і не вырашаным вызначэнне ўплыву навуковай дзейнасці Гаўрылы Гарэцкага на станаўленне беларускай нацыянальнай школы эканамічнай геаграфіі, да прадстаўнікоў якой ён безумоўна адносіцца разам з Мікалаем Азбукіным (1894 – 1943 гг.?), Сцяпанам Маргелавым (1902 – 1937 гг.) і Аркадзем Смолічам (1891 – 1938 гг.). У азначаным артыкуле прапанаваны некаторыя замалёўкі да багатай біяграфіі вучонага, якія, у першую чаргу, скіраваны на пастаноўку пытанняў да ролі Г. Гарэцкага ў гісторыі беларускай эканамічнай геаграфіі.

У першай палове XX ст. сусветная грамадская геаграфія перажывала перыяд актыўнага развіцця і акадэмічнага сталення, які праяўляўся ў стварэнні кафедр ва ўніверсітэтах, фарміраванні новых ідэй і агульным росце колькасці даследаванняў. Так, найбольшае прызнанне ў гэты перыяд атрымалі антрапагеаграфічны (Ф. Ратцэль, Р. Чэлен, Дз. М. Анучын і інш.), харалагічны (А. Геттнер, Р. Хартшорн, В. П. Сямёнаў-Цян-Шанскі і інш.) і штандортны кірункі даследаванняў (І. фон Цюнен, В. Лаунхардт, А. Вебер і інш.). Антрапагеографы лічылі, што геаграфія павінна займацца вывучэннем сувязей паміж прыродай, чалавекам і яго гаспадарчай дзейнасцю праз асаблівасці традыцый, побыту і культуры народаў. Харолагі ставілі ў перавагу даследаванне элементаў, з’яў і працэсаў, якія змяшчаюцца ў геаграфічнай

прасторы. Штандортныя даследаванні былі скіраваны на стварэнне матэматычных ўніверсалій для выяўлення рацыянальнага размяшчэння эканамічных суб'ектаў у геаграфічнай прасторы [1].

Вядома, што названыя кірункі не маглі не паўплываць на станаўленне светапогляду маладога вучонага. Так, у ранніх працах Г. Гарэцкага адчуваецца ўплыў рускай намаграфічнай школы, прадстаўнікі якой (А. В. Чаянаў, Р. І. Баскін, А. М. Чалінцаў, А. А. Рыбнікаў і інш.) захапляліся тэарэтычнымі дасягненнямі нямецкай штандортнай школы і лічылі, што галоўнай задачай эканамічнай геаграфіі з'яўляецца адкрыццё законаў размяшчэння вытворчых сіл, устанаўленне колькасных адносін тэрытарыяльна выяўленных гаспадарчых з'яў ды іх матэматычных заканамернасцей [2, с. 96]. Уплыў вышэйназванай школы абумоўлены тым, што Г. Гарэцкі вучыўся ў Горацкім агранамічным вучылішчы, Уфімскім інстытуце народнай адукацыі і Пятроўскай сельскагаспадарчай акадэміі ў Маскве, якая ў той перыяд лічылася перадавой у сферы аграрнай навукі і якую ён паспяхова скончыў у 1924 г. У Пятроўскай сельскагаспадарчай акадэміі Г. Гарэцкаму чыталі лекцыі А. Чаянаў, А. Рыбнікаў, а таксама М. Д. Кандрацьеў, А. Г. Даярэнка, А. Ф. Фартунатаў [3, с. 89]. А. Чаянаў і А. Рыбнікаў, якіх з упэўненасцю можна назваць «навуковымі бацькамі» Г. Гарэцкага, шырока прымянялі мадэлі І. фон Цюнена і А. Вебера пры вырашэнні задач эканамічнага раянавання тэрыторыі. Таму, пасля пераезду ў Беларусь, Г. Гарэцкі пачынае плённа працаваць на ніве вывучэння яе эканамічнай геаграфіі, спачатку ў 1925 г. загадчыкам кафедры сельскагаспадарчай эканомікі і эканамічнай геаграфіі ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі сельскай гаспадаркі (г. Горкі) і правадзейным членам, а пасля – членам Прэзідыума і Навуковай Рады Інбелкульта, затым з 1927 г. дырэктарам новага Беларускага навукова-даследчага інстытута сельскай і лясной гаспадаркі.

Яшчэ ў Маскве, маючы магчымасць апрацоўваць вялізны статыстычны матэрыял, Г. Гарэцкі ўбачыў, наколькі эканамічна беднай была Беларусь, наколькі адсталай была яе народная гаспадарка, наколькі падначалена яна гаспадарцы больш вялікай дзяржавы – Расіі. Ён зразумеў, што для таго, каб намеціць шляхі выйсця народнай гаспадаркі з такога жудаснага стану, неабходна спачатку вывучыць фактычнае становішча, падлічыць нацыянальны прыбытак Беларусі [3, с. 116]. Таму ў 1926 г. пабачыла свет яго фундаментальная манаграфія «Народны прыбытак Беларусі», прадмову да якой напісаў сам А. Рыбнікаў. Нягледзячы на тое, што названая манаграфія ўяўляе сабой узор эканамічнай работы, у ёй можна прасачыць уплыў на аўтара геаграфічнай навукі. Так, нацыянальны прыбытак вучоны вылічваў па губернях, асаблівую ўвагу надаючы тэрытарыяльным тыпам гаспадаркі і спрабуючы растлумачыць прычыны і заканамернасці падзення або росту аб'ёмаў вытворчасці па рэгіёнах краіны. Пры гэтым, разумеючы, што вылічэнне нацыянальнага прыбытку не дае бачання становішча Беларусі ў сусветнай гаспадарцы, аўтар спрабуе параўноўваць атрыманы падушавы

прыбытак з паказчыкамі іншых краін і рэгіёнаў, адлюстроўваючы, што “*прыбытак беларускага насельніка зусім мізэрны ў параўнаньні з прыбыткам жыхароў Амэрыкі і Заходняй Эўропы*”, а таксама, параўноўваючы даныя 1900 г. і 1913 г., “*...з часам аднасна іх ён робіцца яшчэ больш мізарнейшым, бо ўзрост яго цішэйшы, чым у замежных народаў*”. Аднак Г. Гарэцкі прыходзіць да думкі, што “*узрост прыбытку і вытвару на Беларусі значна папераджае ўзрост насельніцтва*”, таму “*мальтузіанству няма месца на Беларусі*” [4, с. 95]. Гэта сцвярджэнне характарызуе Г. Гарэцкага як маладога, але ўжо сфармаванага навукоўцу.

Пры эканоміка-геаграфічным даследаванні рэгіёнаў і заканамернасцей развіцця іх гаспадаркі Г. Гарэцкі выкарыстоўваў метад эканамічнага профілю. Так, пры напісанні сумеснай з С. М. Малышавым і А. Рыбнікавым работы «Экономическое влияние Москвы на организацию сельского хозяйства области» (1927 г.) для атрымання неабходнай інфармацыі былі арганізаваны экспедыцыі па лініям Пятроўска-Разумоўскае – Дурыкіна, Слуцк – Мглін і Мінск – Магілёў [5, с. 133]. У падрыхтаванай прадмове да выдання А. Чаянаў адзначыў важнасць метаду эканамічнага профілю: “*этот метод должен явиться одним из наиболее дешевых и наиболее быстрых методов обследования еще не изученных пространств*” [6, с. 9]. Адзначым, што ў сучасны перыяд метад эканамічнага прафілю амаль не выкарыстоўваецца, аднак, па нашым меркаванні, ён мае велізарны навуковы патэнцыял пры даследаванні сацыяльна-эканамічнага ўзаемаўплыву населенных пунктаў і практычны – пры сацыяльна-эканамічным картаграфаванні гаспадарчай дзейнасці чалавека.

Таксама пад практычныя запыты маладой дзяржавы у выяўленні яе граніц і неабходнасць доказу расшырэння яе тэрыторыі Г. Гарэцкі пачынае займацца дэталёвым вывучэннем колькасці і этнічнага складу насельніцтва Беларусі, а таксама асаблівасцяў і кірункаў удасканалення яе сельскай гаспадаркі ў агульнавядомых працах «Нацыянальныя асаблівасьці насельніцтва БССР і беларускага насельніцтва СССР паводле перапісу 1926 году» (1927 г.), «Межы Заходняй Беларусі ў Польшчы (нацыянальны склад насельніцтва Заходняй Беларусі)» (1928 г.), «Дасьледчая справа па сельскай і лясной гаспадарцы БССР» (1929 г.). Дэмаграфічныя і сацыяльна-геаграфічныя даследаванні вучонага з’яўляюцца прыкладамі навуковых работ падобнага кшталту, прасякнуты любоўю да Бацькаўшчыны і беларускага народу. У сучасны перыяд яны маюць вялікае адукацыйнае і гісторыка-геаграфічнае значэнне.

Паспяховая праца і відавочны талент, нягледзячы на адсутнасць абароненай кандыдацкай дысертацыі, дазволілі вучонаму прыняць актыўны ўдзел у стварэнні Беларускай акадэміі навук, стаць у 28-гадовым узросце яе правадзейным членам і акадэмікам па галіне эканамічнай геаграфіі. Г. Гарэцкі быў і застаецца самым маладым з абраных акадэмікаў краіны, але яго асветніцкая дзейнасць, прыхільнасць да навуковых уяўленняў, якія ўжо напрыканцы 1920-х гг. у СССР будуць абвінавачаны ў буржуазнасці, прывялі

вучонага да арышту і асуджэння. Перажыць жудасныя сталінскія рэпрэсіі 1930-х гг., нягледзячы на сапсаванае здароўе, фактычна дапамагла геалогія [3]. Яна стала галоўным зацікаўленнем усяго жыцця і адкрыла новую главу ў навуковай дзейнасці вучонага, таму да тагачаснай, спрэс ідэалагізаванай эканамічнай геаграфіі Г. Гарэцкі разважліва так і не вярнуўся.

Такім чынам, дарэвалюцыйнае назапашванне геаграфічных ведаў і актыўнае развіццё капіталістычных адносін стварала перадумовы для паскоранага фарміравання кірункаў грамадска-геаграфічных даследаванняў на беларускіх землях. Неабходнасць паскоранага сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны абумовіла зацікаўленне Г. Гарэцкага ў эканамічнай геаграфіі, заснаванай, па яго ўяўленнях, на палявых даследаваннях, выкарыстанні матэматычных і статыстычных метадаў, дэталёвых разліках і раянаванні тэрыторыі. Ідэі вучонага паспяхова развіваў яго паплечнік і вучань С. Маргелаў, які, будучы загадчыкам секцыі эканамічнай геаграфіі ў Інстытуце экономікі Беларускай акадэміі навук, шырока выкарыстоўваў дасягненні штандортнай школы [7, 8]. Актыўнае супрацоўніцтва двух вучоных стварала падмурак для фарміравання ў беларускай школе эканамічнай геаграфіі новага кірунку даследаванняў, які, па прычыне сталінскіх рэпрэсій, так і не быў напоўніцу раскрыты. У пасляваенны перыяд тэарэтычным падмуркам беларускай эканамічнай геаграфіі становіцца агульнапрынятая раённая школа, што прыводзіць да фактычнага адмаўлення тагачасных вучоных ад навукова-практычных напрацовак папярэднікаў.

## Библиографические ссылки


1. Запрудский, И. И. Значение теорий размещения промышленности для географического образования / И.И. Запрудский // Географические аспекты устойчивого развития регионов [Электронный ресурс]: материалы II международной научно-практической конференции, Гомель, 23–24 марта 2017 г. / редкол.: А. И. Павловский (гл. ред.) [и др.]. Гомель: ГГУ им. Ф. Скорины, 2017. – С. 751–755.
2. Саушкин, Ю.Г. Экономическая география: история, теория, методы, практика. / Ю.Г. Саушкин. – М.: Мысль, 1973. – 559 с.
3. Гарэцкі, Р.Г. Ахвярую сваім «я»… (Максім і Гаўрыла Гарэцкія). / Р.Г. Гарэцкі. – Мінск: Беларуская навука, 1998. – 287 с.
4. Гарэцкі, Г.І. Народны прыбытак Беларусі. / Р.Г. Гарэцкі. – Менск: Выданне Дзяржплану БССР, 1926. – 131 с.
5. Пирожник, И.И. Истоки современной социально-экономической географии в Беларуси / И.И. Пирожник, Г.С. Смоляков // Социально-экономическая география: история, теория, методы, практика: сб. научн. статей. – Смоленск: Универсум, 2011. – С. 130–135.
6. Горецкий, Г.И. Экономическое влияние Москвы на организацию сельского хозяйства области / Г.И. Горецкий, С.М. Малышев, А.А. Рыбников // Тр. НИИ с.-х. экономии. М.–Л.: Московский рабочий, 1927. – № 24. – 126 с.
7. Маргелаў, С.П. Да пытання аб штандорце беконных заводаў на БССР / С.П. Маргелаў // Сельская і лясная гаспадарка, 1927. – № 3. – С. 35–46.
8. Маргелаў, С.П. Праблема ўраджайнасці ў сувязі з развіццём штандорта сельскагаспадарчай індустрыі БССР / С.П. Маргелаў // Сельская і лясная гаспадарка, 1928. – № 5–6. – С. 82–90.